ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Беларусь – мая Радзіма» ў рамках рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта «Збяры Беларусь у сваім сэрцы»

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Дадзенае палажэнне вызначае парадак правядзення абласнога этапу рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекту «Збяры Беларусь у сваім сэрцы» (далей – рэспубліканскі праект).

У 2025 годзе ў рамках рэспубліканскага праекта праводзіцца рэспубліканскі конкурс «Беларусь – мая Радзіма», які прысвечаны 80-ці годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (далей – рэспубліканскі конкурс).

1.2. Арганізатарам абласнога этапу конкурсу з’яўляецца галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага аблвыканкама. Арганізацыйнае і метадычнае забеспячэнне ажыццяўляецца дзяржаўнай установай адукацыі «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі».

**2. Мэта і задачы абласнога этапу конкурсу**

Абласны этап конкурсу праводзіцца з мэтай фарміравання ў моладзі патрыятычных якасцей, паглыблення пачуцця любові да сваёй краіны праз далучэнне іх да даследавання падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі малой радзімы.

Дасягненне пастаўленай мэты ажыццяўляецца праз рашэнне наступных задач:

масавае ўключэнне навучэнцаў у дзейнасць па даследаванні ваеннай гісторыі свайго краю;

далучэння моладзі да захавання гістарычнай памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі свайго краю, пра ўнёсак землякоў у дасягненне Перамогі;

ушанаванне памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны, прапаганда гераізму і мужнасці беларускага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны;

папулярызацыя памятных аб'ектаў (воінскіх пахаванняў і месцаў увекавечання памяці), прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі малой радзімы, уключэнне іх у рэгіянальныя турысцка-экскурсійныя маршруты;

даследаванне жыцця і дзейнасці землякоў – удзельнікаў баявых дзеянняў, партызанаў і падпольшчыкаў, вязняў, загінуўшых мірных жыхароў мясцовасці;

выхаванне беражлівых адносін да гісторыі краю, адказнасці за захаванне гістарычнай памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны на дадзенай тэрыторыі;

стварэнне ўмоў для раскрыцця пазнавальных і творчых здольнасцей навучэнцаў.

**3. Удзельнікі абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу**

У рэспубліканскім конкурсе прымаюць удзел навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах устаноў адукацыі ва ўзросце ад 14 гадоў.

**4. Тэрмін рэалізацыі абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу**

Абласны этап рэспубліканскага конкурсу праводзіцца ў перыяд з 28.07.2025 па 24.10.2025 у тры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў:

першы этап – ва ўстановах адукацыі з 28.07.2025 па 18.08.2025;

другі этап – раённы (гарадскі) з 18.08.2025 па 12.09.2025;

трэці этап – абласны з 12.09.2025 па 24.10.2025.

**5. Парадак правядзення абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу**

5.1. На першым (школьным) этапе абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах праводзяць краязнаўчыя даследаванні аб'ектаў малой радзімы (абмяжоўваецца раёнам), звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны (мемарыяльныя комплексы, помнікі, мемарыяльныя дошкі, магілы ахвяр фашызму, брацкія магілы і індывідуальныя пахаванні); вывучаюць звесткі аб земляках, звязаных з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны.

Падчас даследаванняў удзельнікі конкурсу працуюць з архіўнымі дакументамі, матэрыяламі музеяў, з электроннымі базамі дадзеных («Кніга Памяці Беларусі», «Партызаны Беларусі»), абагульненымі банкамі дадзеных (ОБД «Мемарыял», «Памяць народа», «Подзвіг народа») і іншымі пошукавымі інтэрнэт-рэсурсамі і літаратурнымі крыніцамі; арганізуюць сустрэчы з удзельнікамі і відавочцамі падзей ваенных гадоў, іх сваякамі, мясцовымі жыхарамі.

Распрацоўваюць экскурсійны маршрут з уключэннем не менш за 6 тэматычных аб'ектаў, размешчаных у межах свайго раёна (горада).

Удзельнічаюць у экспедыцыях, паходах і экскурсіях па дадзенаму маршруту, робяць фотаздымкі на маршруце.

Па выніках дзейнасці ствараецца брашура «Беларусь – мая Радзіма», у якой змяшчаецца матэрыял аб «топ-6» аб’ектах ваеннай гісторыі, а таксама земляках, якія зрабілі значны ўнёсак у Перамогу над фашызмам (не менш 2 постацей).

Брашура (pdf файл) уключае: тытульны ліст, інфармацыю аб аб’ектах, карту-схему з адзначанымі 6-цю адметнасцямі, спіс выкарыстаных крыніц.

Інфармацыя аб аб’ектах павінна быць прадстаўлена лагічна ў адпаведнасці са структурай: месцазнагоджанне аб’екта, гістарычная даведка, ўнёсак «выбітных» землякоў у набліжэнне Перамогі. Апісанне аб’ектаў дапаўняецца схемамі, фотаздымкамі, зробленымі на маршруце і інш. Пры выкарыстанні літаратуры неабходна даваць спасылкі ў тэксце (калі матэрыял аўтарскі, то гэта таксама неабходна адзначыць). Інфармацыя аб адным аб’екце павінна займаць не больш 2 старонак.

5.2. На другім этапе ацэньваюцца брашуры дасланыя ўстановамі адукацыі. Ад кожнага раёна (г. Жодзіна) вызначаецца 1 пераможца і прызёры. У трэцім этапе ўдзельнічае адзін пераможца раённага (гарадскога) этапу.

Крытэрыі ацэнкі брашуры:

лагічнасць і змястоўнасць прадстаўленай інфармацыі аб аб’екце;

значнасць аб’екта для сваёй мясцовасці (ці краю);

крэатыўнасць афармлення;

самастойнасць у зборы і аналізе матэрыялу;

наяўнасць спасылак на крыніцы.

5.3. Пратаколы пасяджэння журы з указаннем колькаснага аналізу ўдзельнікаў раённага этапу конкурсу, 1 брашуру пераможцы раённага (гарадскога) этапу, заяўку на ўдзел (дадатак) дасылаюцца на абласны этап да 12.09.2025 (у электронным варыянце) на e-mail: cvir@moiro.by (аддзел суправаджэння патрыятычнага і экалагічнага выхавання для Дубаневіч Д.А.). Тэлефон для даведак: 80172705727.

5.4. На трэцім (заключным) этапе абласнога этапу конкурсу дзяржаўнай установай адукацыі «Мінскі дзяржаўны інстытут развіцця адукацыі» (далей – інстытут) распрацаваныя брашуры кожнага пераможцы другога (раённага) этапу для знаёмства з імі ўдзельнікаў будуць размешчаны на сайце інстытута.

У вызначаны час праводзіцца краязнаўчая віктарына, якая распрацавана на падставе матэрыялаў брашур.

Для падрыхтоўкі вучняў да ўдзелу ў віктарыне напярэдні (за 1,5-2 тыдні) на сайце інстытута (https://moiro.by/) змяшчаюцца брашуры ўдзельнікаў дадзенага этапу.

Па выніках віктарыны 5 навучэнцаў, якія набралі вышэйшы бал, адбіраюцца для ўдзелу ў чацвёртым (рэспубліканскім) этапе конкурса.

5.5. Аўтары, удзельнікі конкурсу, даюць згоду арганізатарам на публікацыю сваіх работ, публічную дэманстрацыю і некамерцыйнае выкарыстанне матэрыялаў (з захаваннем аўтарскіх правоў) з мэтай папулярызацыі рэспубліканскага праекта.

5.5. Падвядзенне вынікаў абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу. Пераможцы і прызёры абласнога этапу конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама.

**6. Арганізацыйныя камітэты**

Для арганізацыі і правядзення абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу на кожным этапе ствараюцца арганізацыйныя камітэты (далей – аргкамітэты).

Аргкамітэт кожнага этапу:

забяспечвае арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне конкурсу;

даводзіць інфармацыю аб конкурсе да ведама ўстаноў адукацыі;

ажыццяўляе персанальны падбор складу журы конкурсу;

аналізуе і абагульняе вынікі конкурсу;

асвятляе ход падрыхтоўкі, правядзення і вынікі конкурсу ў сродках масавай інфармацыі.

Арганізацыйнае правядзенне абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу забяспечваюць:

на першым этапе – установы адукацыі;

на другім этапе – упраўленні (аддзел) па адукацыі, спорце і турызме райгарвыканкамаў, упраўленні па адукацыі райвыканкамаў;

на трэцім этапе – аддзел суправаджэння патрыятычнага і экалагічнага выхавання ДУА "Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі".

Для падвядзення вынікаў абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу на кожным этапе аргкамітэтам ствараецца журы.

Журы на ўсіх этапах рэспубліканскага конкурсу:

ацэньвае праекты, якія прадстаўлены ўстановамі адукацыі;

вызначае пераможцаў і прызёраў адпаведных этапаў конкурсу;

прадстаўляе рашэнні (пратаколы) па выніках конкурсу і іншую неабходную інфармацыю ў адпаведныя аргкамітэты.

**7. Фінансаванне абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу**

Фінансаванне абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу ажыццяўляецца:

на першым этапе – установай адукацыі;

на другім этапе – за кошт раённых, г. Жодзіна бюджэтаў, прадугледжаных на правядзенне мерапрыемстваў;

на трэцім этапе – за кошт сродкаў абласнога бюджэта, прадугледжаных на правядзенне мерапрыемстваў.

Для фінансавання абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспубліка Беларусь.

Дадатак

Заяўка на ўдзел у абласным этапе
рэспубліканскага конкурсу «Беларусь – мая Радзіма»
ў рамках рэспубліканскага грамадзянска-патрыятычнага праекта
«Збяры Беларусь у сваім сэрцы»
_______________раёна (г. Жодзіна),
______________________ установы абласнога падпарадкавання

| № п/п | Прозвішча, імя вучня | Клас | Установа адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога, кантактны тэлефон |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |